

1.



2.

# Патаемнае жыццё рэчаў

## ВЫСТАВА ІВАНА СЕМІЛЕТАВА Ў НАЦЫЯНАЛЬНАЙ БІБЛІЯТЭЦЫ

**У чым сэнс жыцця? Такім пытаннем неаднойчы задаваўся кожны чалавек на працягу свайго жыццёвага шляху. Аднак... не толькі чалавек. Выстава Івана Семілетава знаёміць з партрэтамі звычайных прадметаў і механізмаў, жыццё якіх напоўнена пачуццямі і сур'ёзнымі перажываннямі.**

**Вікторыя Харытонава**

З пункту гледжання мастака-экзістэнцыяліста рэальнасць ляжыць па-за межамі вопыту і спасцігаецца толькі на інтуітыўным узроўні — як працэс перажывання і як нешта значна больш складанае, чым уяўлялася дагэтуль. Экзістэнцыяльны жывапіс падпарадкаваны экспрэсіі пачуццяў. Мастак раскрывае трагедыю жыцця. Аўтару важна зазірнуць углыб выявы і адчуць настрой сваіх герояў, пачуць іх думкі, суперажываць ім. У расповедзе пра таямніцы жыцця звычайных прадметаў і механізмаў погляд мастака заўважае твары і выразы, сілуэты і постаці ў звычайных побытавых рэчах — і перадае гэтае бачанне праз жывапісныя сродкі.

Побытавыя прыстасаванні сумуюць, імкнуцца пазбегнуць выканання сваіх абавязкаў, здзіўляюць гледачоў вынаходкамі. Іншае бачанне аўтара, прызма ўяўлення і ёсць шкельцам, што трансфармуе рэчаіснасць: праз яе звычайныя ракавіна, ванны пакой, труба на маштабных палотнах Івана Семілетава становяцца жывымі асобамі.

Аўтар сабраў у адной экспазіцыі работы, над якімі працаваў з 2002 года. Доўгі час мастака цікавілі і кранали вобразы забытых рэчаў, завадскіх канструкцый, якія выйшлі з ужытку. Звыклая з савецкага часу кафельная плітка, велізарныя трубы, рысы твараў і постацей у лініях механізмаў і будынкаў сталі аб'ектам жывапіснага даследавання. Першая прыдуманая і выкананая работа серыі — «У роспачы». З часам творца змясціў акцэнт з твараў на пачуцці, пакуты механізмаў, рэчаў, прадметаў. Такім чынам вырасла жывапісная серыя, якую выдатны каларыст Іван Семілетаў напісаў у лаканічных, але глыбокіх «механічных» колерах: іржавы, халодны блакітны, мокры шэры, кафельны белы.

Алейная тэхніка дапамагае мастаку перадаць разнастайнасць адценняў і зрабіць механічныя вобразы максімальна рэалістычнымі. Калі прадмет сумуе ў роздуме, то гэты сум дэталёва прапісаны: нахіл галавы, апушчаныя плечы, пусты позірк некуды ўнутр сябе. Калі шасцярэнькі адшукалі нарэшце святло і выглядваюць з велічэзнай прылады, пагружанай у цемру, то да іх пачуццяў, надзей і вясёлага настрою літаральна можна дакрануцца — так срэбрана зіхацяць яны, згрудзіўшыся ў праёме.

Іван Семілетаў пазірае на герояў сваёй серыі з пункту гледжання, блізкага да філосафаў-экзістэнцыялістаў. Партрэты рэчаў выкананы ў аўтарскім стылі, які можна акрэсліць як рэалістычнае фэнтэзі, сентыментальны або экзістэнцыяльны мадэрнізм. Мастак надзяляе сваіх герояў эмоцыямі, страхамі і праблемамі, уласцівымі чалавеку, — свабода выбару, адчай сацыяльнай ізаляванасці, праблема нерэалізаванасці, пытанне сэнсу жыцця, пошук шляху. Аўтар перакананы, што кожны — чалавек ці механізм — здольны адчуваць горыч, крызіс, натхненне, апатыю, бачыць сябе «шасцярэнькай» вялікага механізму — патрэбнай, а часам і лішняй, хоча адбыцца, а не стаць скарыстанай.

Неўладкаванасць і страх, безвыходнасць і свабода асобы ад грамадства, жаданне быць сабой і стаць тым, што просіцца, а не тым, што наканавана формай, — такія пытанні і праблемы перажываюць і вырашаюць для сябе механічныя героі Івана Семілетава.

Можна пазнаць у нейкім механічным партрэце сябе. Але перш за ўсё механічны персанаж прыадкрые дзверцы ў паралельны свет прадметаў і іх праблем — у жыццё кантаўскіх рэчаў у сабе. «Не ўяўленне пра рэчы, як яны нам дадзены, узгадняецца з гэтымі рэчамі як рэчамі ў сабе, а... гэтыя прадметы як з'явы ўзгадняюцца з тым, як мы іх сабе ўяўляем», — лічыў Імануіл Кант. Жывапіс Івана Семілетава — прыклад экзістэнцыяльнага мастацтва, збудаванага на тэхнічнай вобразнасці.



3.

1. У роспачы. Алей. 2002–2011.
2. Аўтапартрэт. Алей. 2002–2009.
3. Фантом. Алей. 2017.